Самапомач

Беларуская Коопэратыўна-Гаспадарчая Часопісь

Год II. | Вільня, Кастрычнік 1933 г. | № 12.

Хай злыдні над намі,
скрыгочуць зубамі
Любі сваю ніву, свой
край,
І, колькі ёсьць сілы,
да самай магілы
Ары, барануй,
засявай!..

ЯНКА КУПАЛА.



Усе вялікія падзеі народаў і ўсе цывілізацыі былі створаныя дабравольнымі стараньнямі аб'яднаных людзей... самапомачу.

Джордж РЭССЭЛЬ.
(Ірляндзец).



ЗЬМЕСТ № 12.

BIEŁARUSKAJA ABECEDA
Беларуская абэцэда.

A, a — А, а.	H, h — Г, г.	Ł, ł, — Л, л.	S, š — Ш, ш.
B, b — Б, б.	Ch, ch — Х, х.	M, m — М, м.	T, t — Т, т.
C, c — Ц, ц.	I, i — I. i.	N, n — Н, н.	U, u — У у.
Ć, ć — ЦЬ, ць.	J, j — Й. й.	Ń, ń — НЬ, нь.	Ŭ, ŭ — Ў, ў.
Č, č — Ч, ч.	Ja, ja — Я, я.	O, o — О, о.	V, v — В, в.
D, d, — Д, д.	Je, je -- Е, е.	P, p — П, п.	Y, y — Ы, ы.
E, e — Э, э.	Ju, ju — Ю, ю	R, r — Р, р.	Z, z — З, з.
F, f — Ф, ф.	K, k — К, к	S, s — С. с	Ž, ž — Ж, ж.
G, g — Ґ, г.	L, l — ЛЬ, ль.	Ś, ś — СЬ, сь.	Ź, ź — ЗЬ, зь.

UVAHA: Pry niedaručeńni vypisanaj hazety z pošty treba zaraz-ža žadać vyjaśnieńnia na tej ža pošcie. I tolki ŭ razie, kali b heta nie pamahło, treba zaraz-ža ab usioj spravie napisać u administracyju „Samapomačy“. Padać pry hetym treba: kali (dakładna padać datu), čamu na jakoj pošcie i jakoha numaru časopisi nia možna było atrymać. Biaz hetycch danych zamienny numar „Samapomačy“ vysyłacca **nie budzie**.

Administracyja „Samapomačy“.

Samapomač

BIEŁARUSKAJA KOOPERATYŬNA - HASPADARČAJA ČASOPIŚ.

Самапомач

Adres: VILNIA (Wilno), Połackaja vul. 4—10.

Hod II	Vilnia, Kastryčnik 1933 h.	Nr 12 (15).

VOX POPULI.

Siańniašnim numaram zamykajem pieršy hod našaha vydaviectva i ŭvachodzim u druhi. Vystaŭlenaje nami na pieršy hod pracy zadańnie prapahavańnia samaje tolki kooperatyŭnaje dumki, jak takoj, možam siańnia ličyć poŭnaściu asiahnutym. Z dumak vykazvanych u piśmach da nas, a taksama z biespasiaredních hutarak z ludźmi, što adviedvajuć nas u redakcyi asabista, možna śmieła vyrašyć, što rovień kooperatyŭnaj śviedamaści na našym siale ŭžo pazvalaje i navat nakazvaje pačynać druhi stupień pracy — *arhanizacyju* samych *kooperatyŭnych placovak*. Damahalisia hetaha asabliva našy pracaŭniki z pravincyi, jakija masava — dziakujem im! — adviedali nas padčas apošnich Vilenskich h. zv. „paŭnočnych" tarhoŭ i Vystaŭki ad 26.VIII da 10.IX s. h, Z hetych-ža dvutydniovych z lišnim hutarak. acenka dasiulešnaj pracy i plan hetaj pracy-na budučyniu pradstaŭlajucca hetak:

Dasiulešniaja pryhatavaŭčaja praca, viedzienaja redakcyjaj „Samapomačy", usimi pryznajecca za adpaviednuju, kab kala jaje i na dalej hurtavać usie śviedama bielaruskija kooperatyŭnyja siły. Jak konkretnaja zadača dla dalšaj pracy „Samapomačy" vyznačajecca pryhatavańnie hruntu da sarhanizavańnia asobnaha biełaruskaha kooperatyŭnaha arhanizacyjna-haspadarčaha centru. Dziela hetaha cełу rad biełaruskich kooperatyŭnych pracaŭnikoŭ — z Vilni i vioski — biaz roźnicy palityčnych prakanańniaŭ, daŭ svaju zhodu na supracoŭnictva ŭ redakcyi „Samapomačy". Kirunak pracy na budučyniu pavinien iści pa linii padličeńnia našych sił i placovak užo isnujučych, pryhatavańnia ludzkoha materyjału dziela sarhanizavańnia placovak novych i paviazańnia ŭsiaho biełaruskaha i kooperatyŭnaha ŭ adzin ahulny centr.

Pahroza źmieny polskaha kooperatyŭnaha zakonu z 29.X.1920 h. — ab čym pišacca ŭ siańniašniaj „Samapomačy" na inšym miescy— našła taksama žyvy vodklik u hutarkach našych supracoŭnikaŭ: usie zhodny z tym, što najbližejšyja paru tydniaŭ, pokul novy zakon nia ŭvojdzie ŭ siłu, treba vykarystać dziela zasnoŭvańnia novych kooperatyŭnych placovak, dzie tolki dla hetaha ŭžo pryhatavany hrunt; a dzie hety hrunt jašče nie pryhatavany — zrabić heta jakmaha chutčej.

Usiudy, a asabliva pa vioskach, vielmi baluča dajecca adčuć niastača fachova-pryhatavanych ludziej da viadzieńnia kooperatyŭnych placovak. Dziela hetaha redakcyja „Samapomačy" zabaviazałasia ŭ jak najchutčejšym časie pastaracca sarhanizavać biełaruskija kooperatyŭnyja koresponcyjnyja kursy.

Urešcie — što varta padčyrknuć z asablivym naciskam — usie našy pavažanyja supracoŭniki zhodny ŭ tym, što sprava budavańnia našaha narodnaha dabrabytu, heta sprava nie adnaho dnia, a doŭhich hadoŭ. Pieraškody ŭ samaj pracy mahčymy nia tolki z — vonkaŭ, ale i z nutra, z boku roznych biezadkaznych — i „biełaruskich" — elementaŭ, katorym nie pa dumcy haspadarčaje ŭzmacavańnie i ŭniezaležnieńnie našaha narodu: zastrachavacca ad napadkaŭ z ichnaha boku nia možna jnakš, jak tolki vytryvałaj pracaj u raz abranym kirunku — haspadarčaha, a za im i ŭsienarodnaha ŭzmacavańnia Narodu praz biełaruskuju kooperacyju.

Hetkim pačuŭsia nam Hołas Narodu — *Vox populi* ŭ spravie biełaruskaj kooperatyŭnaj pracy, hetak budziem jaho pravodzić i da hetaha zaklikajem usich biełarusoŭ, chto vieryć u adradžeńnie našaha narodu svaimi sobskimi siłami - kooperatyŭnaj samapomačču.

Red.

Karystacca časopiśsiu, nie apłaciŭšy za jaje padpiski, heta biasporaŭnaje prysabiečvańnie čužoj pracy, čužoha mazala, čužoha zdaroŭja — heta zvyčajnaja kradzieža! — Ci Vy ŭžo poŭnaściu apłacili padpisku za „Samapomač"?

Prad novym kooperatyŭnym zakonam ŭ Polščy.

Jašče ŭ novahodnim siołetnim numary „Samapomačy“ pisali my ab niebiaśpiecy źmieny kooperatyŭnaha zakonu ŭ Poiščy. Pradstaŭnik uradu vystupiŭ tady ŭ Kooperatyŭnaj Radzie z prajektam zakonu, katory vielmi abmiažoŭvaje niezaležnaść i samaŭradavańnie kooperacyi. Hety prajekt Kooperatyŭnaja Rada adnahałosna adkinuła, motyvujučy svaju pastanovu tym, što prajektavany zakon zvužvaje jakraz tyja asnovy — niezaležnaść i samaŭradavańnie,— z katorych kooperacyja čerpaje svaje siły. Na hetkaje stanovišča kooperatyŭnaj Rady pradstaŭnik uradu zajaviŭ u tym sensie, što kali na prajektavanuju źmienu Kooperatyŭnaja Rada nia zhodzicca, dyk urad usio-ž ad svajej dumki nie adkažycca, a da praviadzieńnia hetaj dumki ŭ žyćcio „maje dosyć inšych sposabaŭ“, ad voli Koop. Rady niezaležnych.

Ad henaha času pytańnie źmieny kooperatyŭnaha zakonu byccam syšło z aficyjalnaj paviestki dnia, ale nie pierastała być aktualnym u kruhoch samych kooperataraŭ. Naadvarot, pačalisia narady, konferencyi, u vyniku jakich źjavilisia adumysnyja publikacyi, vyjaśniajučyja prad cełym śvietam, što ahraničeńnie kooperacyi ŭ pravoch rożvitku roŭnaznačna z adniaćciem ad jaje pravoŭ da žyćcia. Dasiulešniaja dziejnaść kooperacyi adnak dała niaźličanyja dokazy karysnaści dla najšyrejšych — i najbiadniešych — kruhoŭ nasielnictva. I dzieła hetaha ahraničeńnie volnaj dziejnaści kooperatyvaŭ b'je pa najbolš žyćciovych intaresach hetaha-ž biednaha nasielnictva...

I mima ŭsio heta ŭ pieršych dniach vieraśnia s. h. praskočyła praz presu viestka, a ŭłaśsiva prajekt novaha kooperatyŭnaha zakonu, pryhataŭlanaha hetym razam užo jak prezydenskaje rasparadžeńnie z mocaj ustavy. Hety prajekt jość vynikam doŭhich naradaŭ i źmienaŭ, źmienaŭ što raz bolš zvužyvajučych pravy kooperacyi. Zvužyvańnie heta praśleduje kooperatyvu ad času jejnaha zasnavańnia i da samych viarchoŭ arhanizavanaści. Voś niekatoryja punkty novaapracavanaha prajektu kooperatyŭnaha zakonu:

Pavodle 5 ha art. prajektavaha zakonu Sud nia budzie mieć prava rejestravać statutu kooperatyvy datul, pakul jana nie pradstavić z Kooperatyŭnaj Rady — event. z Revizyjnaha Sajuzu — paśviedčańnia ab tym, što *„pravametnaść zasnavańnia kooperatyvy i jejnyja haspadarčyja namiery, vyjaŭlenyja ŭ statucie, nia vyklikajuć zaściarohaŭ“*. Dahetul, jak viedama, Sud, rejestrujučy statut kooperatyvy, nie ŭvachodziŭ u varažbu, ci novazasnoŭvanaja kooperatyva maje „pravametnyja haspadarčyja namiery“ ci ich nia maje (chto heta moža adhadać napierad?), a hladzieŭ tolki za tym, ci statut farmalna ŭ paradku. Pry miescy tak-ža zaznačyć, što hetkich abmiežavańniaŭ nia znajuć ni pryvatniki, ni nijakija inšyja pryvatna-kapitalistyčnyja pradpryjemstvy; hetkaj byccam planovaściu abstaŭlajucca tolki i vyklučna kooperatyvy. Kali-b hety punkt zakonu rehularna datrymlivaŭsia, dyk na budučyniu jakuju-niebudź kooperatyŭnuju placoŭku možna było-b adčynić tolki tam, dzie na heta pazvolić administracyjnaja ŭłada, a značа zamiest dasiulešniaj rejestracyi ŭvodzicca svajho rodu koncesija, katoraja, čaho dobraha, mieryć prosta ŭ... manapol.

Ale hetaha mała. Prava paasobnych kooperatyvaŭ łučycca dabravolna pamiž saboj

---

Коопэрацыя ў Баўгарыі.

(*На дзень Ашчаднасьці 31 кастрычніка*).

Чэскія „Zemed. Družst. Listy“ у № 38 с. г. перадаюць зьмест стацьці аб коопэрацыі ў Баўгарыі, напісанай ведамым коопэратарам праф. В. Тотомянцам. Зьмест гэтай стацьці так цікавы і так павучаючы, што ня можам устрымацца, каб не пазнаёміць з ёй — мясцамі даслоўна — і нашых чытачоў. Паўдзённыя браты нашы Баўгары ў коопэрацыі могуць і сапраўды павінны нам беларусом быць прыкладам.

Баўгарыя — гэта бацькаўшчына Баўгараў, невялікага лікам славянскага народу. Займае яна сягоньня на балканскім узьбярэжжы Чорнага мора ўсяго 103.000 квадратовых кілёмэтраў, а лік самога насельніцтва сягае 6.000.000 чалавек. Пры мейсцы трэба зазначыць, што лік Беларусоў пад Польшчай дасягае 2.500.000 чал., якія засяляюць няцэлых 90.000 квадратовых кілёмэтраў. Баўгарыя гэта старонка пераважна дробнага і сярэдняга земляробства, сьвядомага свайго клясавага стану. Земляробствам займаецца 83% жыхарства, рамесьніцтвам — 9, гандлем — 7 і інш. — 1.

Да 1878 году баўгары былі „краем забраным“, бо жылі пад турэцкім панаваньнем. Вызваліўшыся з няволі, пачалі разьвівацца не адразу: не хапала сіл, якія пагінулі ці то ў няволі, ці то ў вызвольнай барацьбе і вайне. Першая крэдытовая коопэратыва тыпу Райфайзэна была заснавана толькі ў 1890 г. Удача гэтай коопэратывы спрычыніла засноўваньне коопэратываў дальшых, крэдытовых і спажывецкіх. Найлепш аднак разьвіваліся народныя банкі, засноўваныя ад 1903 г. паводле тыпу Шульц-Дэлітцшэ. Цікава, што разьвіцьцё гэтых банкаў у Баўгарыі выперадзіла нават разьвіцьцё такіх-жа банкаў у Нямеччыне, дзе яны нарадзіліся і най-

u sajuzy značna ahraničvajecca tej-ža ŭładaj administracyjnaj. Zasnoŭvańnie novych sajuzaŭ zaležycimie ŭsioceła ad ministerstva skarbu, a sajuzy ŭžo isnujučyja ŭ praciahu aznačanaha času prava na dalšaje isnavańnie musiać nabyć ad ministra tak, jak-by hetaha prava dahetul i zusim nia mieli. Pry hetym ministr moža abmieżyć pole pracy danaha Sajuzu tolki da peŭnaha vidu kooperatyvaŭ, napr. tolki spažyvieckich, tolki kredytovych ci jakich inšych, abo da peŭnaha tolki abšaru, napr. da adnaho dvuchtroch vajavodztvaŭ; ministr moža taksama pavodle svajej dumki dziejnaść hetkich sajuzaŭ rasšyryć, abo dva ci niekalki sajuzaŭ złučyć u adzin. Revizoraŭ Revizyjnych Sajuzaŭ zaćviardžaje tak-ža ŭradaviec ministerstva Skarbu.

Karystajcie z času i zaraz-ža zakładajcie kooperatyvy, pokul dzieić „stary“ zakon, bo zaŭtra moža być užo pozna!

Nia sposab vyličyć usich źmien, uvodžanych prajektam novaha zakonu. Ale i skazanaha dosyć, kab pierakanacca ab tym, kudy ŭsio kirujecca. Vyvad zhetul prosty: nia pieršy heta i nie apošni naskok na kooperacyju, jak prajavu samadapamahovaj hramadzkaj akcyi. Nia možna taicca, što niebiaśpieka vialikaja. Ale pryniaŭšy pad uvahu stohadovuju ŭžo blizka žyvučaść kooperacyi i stychijnuju prosta zacikaŭlenaść jeju — i ŭ nas! — samych šyrokich kruhoŭ nasielnictva, treba vieryć, što **raz zbudžany ŭ narodzie zdarovy vodruch voli haspadarčaha adradžeńnia ŭžo nikoli nie zamre,** a znojdzie darohu i sposab prabicca na śviet. A heta jość najvažniejšaje. Usiakija-ž zapory i parohi na darozie hetaha pachodu tolki ŭzdymuć narodnuju volu i dapamohuć da akančalnaje pieramohi.

A. K.

Zamiest adkazu.

„Бел. Газэта“ u №№ 7 i 8 s. h. systematyčna starajecca spravakavać nas da sprečak z joju na temy, jakija z kooperacyjaj ničoha supolnaha nia majuć, pryčym nie zapyniajecca navat prad sprobaj niaŭdałaha defenzyŭnaha na nas danosu. Škadujem vielmi, ale nia mohučy va ŭsioj redakcyjnaj pisanini „Бел. Газэты“ znajšci choć śled znajomaści pytańnia, ab jakim paryvajecca pisać — ab kooperacyi, a tolki pustyja vydumki i asabistyja napadki, — zmušany ŭstrymacca tut ad pravakavanaha adkazu i ahraničycca da zvyčajnaha śćvierdžańnia faktu, što „Бел. Газэта“, biaz nijakaj pryčyny z našaha boku, dalej viadzie znutra škodnaje raźbivańnie samatužnaj biełaruskaj pracy nad adbudavańniem dabrabytu zhaleŭšaha našaha pieradusim sialanstva i rabotnictva. Na hetkaje stanoviščа pisakaŭ z „Бел. Газэты“ majem adzin tolki adkaz: stanavieciesia choć na hałavu, kali hetaha žadajuć ad vas vašy chlebadaŭcy, — heta jšče nia dokaz, kab i my rabili heta samaje. — My nie akrobaty i naśladavać vas nia majem ni času, ni achvoty. Za šmat u nas konkretnaj pracy kooperatyŭnaj, dziela jakoj „Samapomač“ była zasnavana, dziela jakoj pracavała i pracuje i dziela pracy ŭ jakoj prybyvajuć štoraz novyja i novyja siły.

Nia chočam sudzić i pisakaŭ z „Бел. Газэты“. Ale niaščasny toj, chto sam nia ŭmiejučy račova pryłažycca da pracy, hetu pracu *u rašučuju chvilinu i ŭ prypražku niebiaśpiekam z vonku,* z čuzackaha nakazu ci svajej tupaści, ŭparta starajecca raźbić znutra.

Admaŭlajučysia vieści biaspłodnuju polemiku na hetym miescy na temy palityčnyja, my zaŭsiody hatovy vyjaśniać istotu dumki kooperatyŭnaj.

r.

перш разьвіваліся. У Баўгарыі гэтыя банкі служаць усім клясам насельніцтва — і земляробству, — тады як у Нямеччыне яны пераважна мяшчанскія: у 1930 г. рахавалася ў Баўгарыі 114 народных банкаў сялянскіх і 98 мяшчанскіх.

У тым-жа 1930 г. крэдытовых коопэратываў тыпу Райфайзэна было ў Баўгарыі 1.432, з 152.575 сябрамі, а народных банкаў — 212, з 139.999 сябрамі. Фінансавая моц народных банкаў у 1929 г. выказвалася ашчаднасьцю 1.403.133 тысяч леваў (100 л. = 6.40 зл.).

Соцыяльны склад сяброў гэтых банкаў вельмі рознародны і гэта рэгулюе попыт і подаж капіталаў. Пры гэтым сяброўства сялян у банку стала ўзрастае, бо новыя банкі па сёлах усьцяж засноўваюцца.

Саюз баўгарскіх народных банкаў у Софіі — сталіцы краю — быў заснаваны толькі ў 1915 годзе, але росквіту дачакаўся толькі ў 1920 г., калі стаўся крэдытовай цэнтраляй паасобных банкаў. Да гэтых заданьняў крэдытовай цэнтралі з часам далучыўся йшчэ збыт (продаж) земляробскіх прадуктаў і супрацоўніцтва пры зарганізоўваньні электрычных станцыяў і г. п. Ашчаднасьці народных банкаў, зарганізаваных у Саюзе, ў 1931 г. дасягні сумы 1.326.376 тысяч леваў.

Побач з дзейнасьцю крэдытовай, баўгарскія народныя банкі арганізуюць збыт земляробскіх (жыта, вінаград, яйкі і пад.) і прамысловых вырабаў сваіх сяброў, маюць свае спажывецкія крамы, арганізуюць электроўні, пякарні, лазьні, тарговыя гальлі і інш. У 1931 г. прадалі банкі тавару на 98.227 тысяч, а закупілі на 526.579.663 левы. Электроўняў было ў тым-жа 1931 г. 17, пякарняў—7, вінных крамаў — 6, краўцоўская майстроўня—1, фабрыка музыкальных інструмэнтаў— 1 і г. д.

Саюз народных банкаў вядзе таксама дзейнасьць культурна-прасьветную ва ўсіх кірунках.

I ŭšyrki i ŭhłybki.

Chto znaje siańniašnija nastroi biełaruskaj vioski, toj viedaje, jakija postupy zrabiła tut apošnim časam kooperatyŭnaja śviedamaść. Nie apošniaja ŭ hetym zasłuha i „Samapomačy". Ale nie ab heta nam tut idzie. Tut chočam padčyrknuć tuju praŭdu, što siahońnia biełaruskim kooperatyŭnym pracaŭnikom nia čas adpačyvać na zdabytych łaŭrach, bo ,,chto nia jdzie napierad, toj varočajecca". Dyk iści treba napierad! Napierad ušyrki i ŭhłybki.

Kooperatyŭnaja śviedamaść zrabiła ŭžo postupy ŭšyrki, ale masy, čałaviek u čałavieka, da kooperacyi ŭ nas jašče nie pryhatavany. Vykanać heta — voś čarhovaje naša zadańnie, jakoje treba pravieści arhanizavana, tak, jak heta ŭściaž robiać narody kooperatyŭna daśpiełyja.

Zahadzia ŭmoŭleny čas — tydzień, dva, miesiac — abviaščajecca *kooperatyŭnym*, npr. tydzień (ci miesiac) kooperacyi. U hetym časie ŭsie intelihientnyja siły jduć pa siołach, vioskach i miastečkach, sklikajuć schody, abo pryvatna jduć ad chaty da chaty, usiudy prapaviedvajučy adnu i tuju-ž ustanoŭlenuju napierad u prahramie Tydnia (Miesiaca) dumku. Hetak u adnym kirunku skoncentravany supolny vysiłak zahranicaj akazaŭsia vielmi pravametnym: čamuž by jon nia mieŭ być pravametnym u nas-Biełarusoŭ?—Ustrymlivajučysia ad dalšych padrobnaściaŭ, siahońnia ŭžo možam zdradzić namier sarhanizavańnia takoha *Miesiaca biełaruskaj kooperacyi* ad pałovy m-ca listapada ci pačatku śniežnia i ŭ nas. Plan i prahrama dziejnaści, a taksama patrebnyja instrukcyi buduć u čas vydany i razasłany tym, chto piśmienna paviedamić našu redakcyju ab svajej zhodzie pracavać kolki zmoža ŭ hetym časie i napramku.

Ale patrebna praca i ŭhłyki. Isnujučyja kooperatyvy nie razaŭjucca i novyja nie zasnujucca, kali nia budziem mieć dosyć ludziej, jakija byli-b fachova z kooperacyjaj abaznany. U škoły kooperatyŭnyja jechać nia kožnamu dastupna. Škoła hetkaja adnak sama moža pryjści da kožnaha ŭ chatu ŭ formie Kooperatyŭnych Korespondencyjnych Kursaŭ. Dapuščanym da hetkich kursaŭ moža być kožny, chto dobra abaznany z čytańniem, pisańniem i rachunkami. Pryhatavańni da Koresp. Koop. Kursaŭ užo robiacca i kožny achvotny karystać z hetkich kursaŭ moža ŭžo prysyłać u red. „Samapomač" zajavu ab pryniaćci na kurs.

Heta dva napramki konkretnaj kooperatyŭnaj pracy na najbližejšuju budučyniu. Namierany my jaje pravodzić biaz uvahi na toje, chto jak na heta budzie hladzieć. Na złosna-ž pašyrany ab našaj pracy pahlad, jak ab „intryzie palityčnaj" zajaŭlajem, što adzinaj i prostaj palitykaj našaj, jak kooperatyŭnych pracaŭnikoŭ, jość ustrymać narod naš ad vyniščeńnia fizyčnaha i vyklikać u im siły da žyćcia samadziejnaha. Da hetkaj palityki majem — mieć musim! — nia tolki prava, ale i abaviazak!

M. V.

Hramadzkim abaviazkam kožnaha śviedamaha Biełarusa, asabliva Biełarusa-intelihienta jość biezadkładna zapisacca ŭ red. „Samapomačy" da čynnaha ŭčaścia ŭ MIESIACY BIEŁ. KOOPERACYI.

Арыгінальнасьцю,баўгарскай коопэрацыі зьяўляюцца коопэратывы дзеля збыту табакі і алею з ружаў. Баўгарская табака належыць да найлепшых сусьветных сартоў і займае важнае месца сярод экспортных прадуктаў. Тое самае трэба сказаць і аб дарагагім (пахучым) алею з ружаў. Табачныя коопэратывы (дзеля гадаваньня і збыту), лікам 15, маюць у Софіі свой гандлёвы і фінансавы саюз, гадавы абарот каторага дасягае 300.000.000 леваў.

Ружава-алейных копэратываў у Баўгарыі ёсьць шэсьць і іхная прадукцыя складае толькі 10⁰ ₀ агульнае прадукцыі алею з ружаў у Баўгарыі.

Акрамя народных банкаў, райфайзэнак, коопэратываў табачных і алейных, ёсьць у Баўгарыі (1931 г.) 13 коопэратываў дзеля агульнага страхаваньня, 830 коопэратываў дзеля страхаваньня жывёлы, коопэратывы гасп. спажывецкія і г. д. У Софіі ёсьць напалову коопэратыўны, напалову дзяржаўны цэнтральны банк. Усяго ў Баўгарыі ёсьць 3.505 коопэратываў, з 750.000 сябрамі; гэта знача большая палова насельніцтва Баўгарыі арганізавана ў коопэратывах.- Відаць з гэтага, што Баўгарыя належыць да краёў найсільней скоопэратызаваных. Коопэрацыя таксама памагла Баўгарыі апра віцца з пасьляваенных (балканскай і сусьветнай) стратаў. Баўгарыземляробы асабліва скарысталі з коопэрацыі: сарганізаваньне крэдыту, машыновых супалак, закупу і збыту, перапрацоўкі земляробскіх прадуктаў у адумысловых (табачных, алеярскіх) земляробска вытворчых коопэратывах — усё гэта падняло баўгарскага селяніна з прымітыўнага стану да вышыні, якая заручае яму пачэснае месца ў сьвеце культурна дасьпелых грамадзян і коопэратараў.



Kooperatyŭnyja naviny.

Arhanizacyjnaje:

Da supracoŭnikaŭ - karespandentaŭ! Redakcyi „Samapomačy“ nieabchodna mieć informacyi ab usich biełaruskich kooperatyvach, asabliva-ž ab kooperatyvach h. zv. „dzikich“, niezaležnych ad jakich-niebudź isnujučych na našych ziemlach Sajuzaŭ. Dziela hetaha prosimo kožnaha z našych supracoŭnikaŭ sabrać pa mahčymaści poŭnyja viestki ab usiakaha vidu kooperatyvach u svaim rajonie i pierasłać ich nam. Važna viedać: 1. nazoŭ kooperatyvy i jaje charaktar (spažyvieckaja, kredytovaja, vytvorčaja, npr. małačarnia i h. d.), 2. kali zasnavana, 3. naležyć da jakoha Sajuzu ci nie, 4. pracuje ci nie i kali nie, to čamu, 5. jakaja śviedamaść nacyjanalnaja, 6. jak adnosicca da kooperatyvy miascovaje vučycielstva, duchavienstva i inš. miascovaja intelihiencyja, 7. ci jość na miejscy intelihiencyja biełaruskaja i hrunt pad zasnavańnie kooperatyvy novaj, 8. *ci dachodzić u vokruh dziejnaści kooperatyvy „Samapomač“* i kali nie, to kamu možna było-b pasłać probny numar hetaje časopisi, 9. dakładny adres kooperatyvy i 10. inšyja cikavyja asablivaści datyčnaj kooperatyŭnaj placoŭki.

Hetyja i padobnyja viestki patrebny redakcyi dziela pačynańnia pieršych krokaŭ arhanizavanaha dachodžańnia pravoŭ naležnych kožnaj kooperatyŭnaj placoŭcy.

Hramadzianie! Spoŭniecie hramadzki abaviazak i prošanyjaja viestki pryšlecie pamahčymaści chutčej.

Jak moža niechta paryvacca rabić „pieradzieł“ suśvietu, nie patrapiŭšy zrabić hetkaha „pieradziełu“ ŭ adnej choć-by vioscy — sarhanizavać u joj adnu — adzinuju kooperatyvu?!

— Biełaruski Spažyviecki Kooperatyŭ „RAJNICA“ z adkaznaściu pajami ŭ Vilni“ — hetak nazyvajecca novaja biełaruskaja kooperatyŭnaja placoŭka ŭ Vilni, zasnavanaja na Arhanizacyjnym schodzie dnia 17 vieraśnia s. h. ŭ pamieškańni Bieł. Instytutu Hasp. i Kultury (Zavalnaja 1—1). Nahladnaja Rada „Rajnicy“, ufarmavanaja na svaim pasiedžańni dnia 25 vieraśnia s. h., pradstaŭlajecca hetak: staršynia — A. Klimovič, vice staršynia — S. Paŭłovič, sekretar — mgr M. Škielonak, siabry: — J. Malecki, I. Bindziuk i Dr. T. Kunicki. Uprava „Rajnicy“, vybranaja na tym-ža pasiedžańni Nahladnaj Rady, pradstaŭlajecca hetak: staršynia — M. Mancevič, skarbnik — J. Najdziuk i sekretar — Uł. Kazłoŭski. Tymčasovaja kantora „Rajnicy“ mieścicca ŭ pamieškańni Bieł Kooperatyŭnaha Banku pry vul. Karaleŭskaj 3—8. — Statut „Rajnicy“ ŭžo padany ŭ sud na zaćvierdžańnie. Uruchomleńnia „Rajnicy“ treba spadziavacca ŭžo ŭ m-cy listapadzie. Zaleža heta pamiž inšym ad chutkaha sabrańnia vystarčajučaha liku pajoŭ, bo siahońnia kožnaja kooperatyŭnaja placoŭka musić pracavać tolki svaimi ŭłasnymi siłami i srodkami.

Dziela hetaha siahońnia moralnym abaviazkam kožnaha vilenskaha Biełarusa jość zapisacca siabram u „Rajnicu“, zapłacić tudy svoj paj i źbirać novych pajščykaŭ pasiarod svaich znajomych. Adzin paj „Rajnicy“ vynosić tolki 10 zł. biaz nijakaj dalšaj adkaznaści. Pry zapisańni ŭ siabry možna płacić tolki pałovu paja, h. zn. 5 zł. Zapis u siabry „Rajnicy“ prymaj- kantora (Karaleŭskaja 3—8), redakcyja „Samapomačy“, Vil. Addzieł Bieł. Instytutu Hasp. i Kultury (Zavalnaja 1—1) i ŭsie siabry Ŭpravy i Nahladnaj Rady „Rajnicy“.

Aryjentacyjnaje:

Redki ale vitany hość. U pieršych dniach m-ca vieraśnia s. h., adviedvajučy Lniarskuju Vystaŭku, adviedaŭ i našu redakcyju hram. Astap Łućkyj, Dyrektar Revizyjnaha Sajuzu Ukrainskich Kooperatyvaŭ u Lvovie. Hram. Łućkyj cikaviŭsia kooperacyjaj na biełaruskich ziemlach i ŭzamien padzialiŭsia z našaj redakcyjnaj kalehijaj viestkami ab kooperacyi na ziemlach ukrainskich.

— Film i kooperacyja. Kooperatary ŭsiaho śvietu źviartajuć vialikuju ŭvahu na prapahandu svaje dumki ŭsiakimi mahčymymi sposabami. Adnym z takich novačasnych sposabaŭ jość film (kino). Voś-ža kolkaść kooperatyŭnych filmaŭ jasna pakazvaje śpiełaść samaje kooperacyi: čym bolš filmaŭ, tym śpialejšy ruch i naadvarot. Hetak Švajcaryja maje 37 kooperatyŭnych filmaŭ, Japonija — 26, Anhlija — 21, Niamieččyna — 20, Łatvija — 19, Rasieja — 14, Švecija — 12, Danija — 10, Francyja — 9, Holandyja — 5, Čechasłavaččyna, Norvehija, Holandyja i Indyja — pa 4, Aŭstryja — 3. Rumynia — 2, Arhientyna, Belhija i Polšč — pa 1.

— Volnaja prodaž časopisiaŭ. Skarbovyja ŭłady pazvolili biez składańnia indyvidualnych zajavaŭ (prośbaŭ) viaści pabočnuju prodaž krajovych peryjodyčnych časopisiaŭ u pradpryjemstvach tavarovaha handlu, kniharniach, pradpryjemstvach gastronomičnych, biez abaviazku vykuplivańnia asobnych patentaŭ (pramysłovych paśviedčańniaŭ). Abaroty z prodažy časopisiaŭ nie padlahajuć apadatkavańniu. Palohka heta važna ŭžo ad 1 studzienia 1933 h.

Našy kooperatyvy pa vioskach asabliva musiać z hetaj palohki jak najšyrej skarystać i ŭviaści ŭ siabie prodaž pieradusim kooperatyŭnaj časopisi „Samapomač“

Сельская гаспадарка.

Глыбей у глебу!

За ўраджайнасьць сваю глеба ўдзячна перадусім прыродзе. Прыродныя запасы аднак з глебы хутка вычэрпываюцца і іх трэба дапаўняць спосабам штучным: адпаведным абрабляньнем глебы і ўгнаеньнем.

Гнаеньне глебы гэта ўжо завяршэньне ўсіх стараньняў над абнаўленьнем вычэрпанай яе прыроднае сілы. Прад тым аднак як глебу гнаіць, яе трэба адпаведна абрабіць і надаць ей адпаведную ўнутраную будову (структуру) і выраўнаць запасы вады. Да гэтага служаць: ворка, баранаваньне, валаваньне і г. д. Усё гэта аднак разам узятае паляпшае глебу на вельмі нязначную толькі глыбку і дзеля таго яно вельмі нятрывалкае. А каб глеба, раз абноўленая (папраўленая), даўжэйшы час не псавалася, трэба адразу папраўляць грубейшы яе пласт ці выразьней

кажучы — глыбейшы. Найадпавяднейшай на гэта парой ёсьць восень.

Паглыбляньне глебы гэта сягоньня, пры безрабоцьці і нястачы грошай на штучнае ўгнаеньне — найдаступнейшы спосаб падняцьця культуры нашых палёў. Адразу трэба аднак зазначыць, што паглыбляньне раптоўнае, пры каторым адразу выдабываецца на верх г. зв. *мярцьвіца*, можа быць і сапраўды бывае шкодным. Дзеля гэтага паглыбляньне воркі гэта работа не аднаго году, а некалькіх, асабліва на полі з натуры сваей мелкім і бедным на кармовыя сучасткі. У гэткім выпадку трэба падбаць ня гэтулькі аб выдабываньні глыбокага пласту зямлі зыспаду наверх, колькі аб самым толькі *ўзварушэньні* (ўспульхненьні) гэтага глыбокага пласту. Служыць да гэтага можа або сумысная снасьць званая *паглыбнікам* (папольску — pogłębiacz), або звычайны плуг — абсыпнік, ужываны да аборываньня бульбы, з аднятымі толькі ад яго бочнымі паліцамі.

Ужываньне сумыснага паглыбніка вымагае аднак вялікай запрэжнай сілы (найменш двух, а нават чатырох сільных коняў), чаго ў сялянскіх гаспадарках звычайна няма. Тут трэба дзеля гэтага набавіць часу і дарогі: або наперад пускаецца баразна звычайнага плугу, а за ёй другі (наняты) конь цягне плуг —абсыпнік; або, аручы адным канём, прыходзіцца пры канцы кожнай баразны перапрагаць каня з плуга ў абсыпнік і праглыбляць баразну выараную плугам звычайным.

Так ці гэтак праводжанае паглыбляньне глебы праветрывае яе, уводзіць у глыбшыя пласты карысную чыннасьць бактэрыяў, узбагачвае глебу ў перагнойныя сучасткі, ад чаго сама глеба вясной хутчэй перасыхае, а ў сухую пару лепш трымае вільгаць. Урэшце, што ёсьць бадай найважнейшым, самыя засевы на паглыбленай глебе могуць лепш закарэнівацца і сільней расьці.

Усё гэта прамаўляе за тым, каб мелкія глебы нашых палёў неадкладна пачынаць паглыбляць. У першую-ж чаргу павінны быць паглыблены палеткі, якія на вясну будучага году празначаюцца пад акопніны. Глыбака ўзараная ці толькі паглыбленая глеба пакідаецца на зіму ў вострай баразьне, каб мароз раскрышыў суцэльныя глыбы.

Пры канцы яшчэ раз трэба зазначыць, што восень гэта самы час на паглыбляньне глебы. Хто гэтага ня зробіць, а восень змарнуе ў бясчыннасьці, той ня можа пасьля наракаць на неўраджайнасьць свайго поля, бо з парожнага не нальле і Саламон.

С. Я.

На сенажацях увосені.

Калі праўдай ёсьць, што нізка стаіць культура нашых палёў, дык яшчэ ніжэй стаіць культура нашых сенажацяў. А шкода, вялікая шкода! Бо недагледжаныя сенажаці не пазваляюць належна разьвіцца жывёлагадоўлі, без чаго ўзноў поле церпіць ад нястачы гною, а ўся гаспадарка і сам гаспадар вядуць жыцьцё сухотніка. Чаго-ж тады сенажаці патрэбуюць, каб быць ураджайнымі?

Каротка: сенажаць, як і аромае поле, патрабуе час-ад-часу дагляду і ўгнаеньня. Восень якраз ёсьць тэй парой, калі адно і другое можа быць праводжаным.

Нярухомае дзярно сенажаці з часам заменяецца ў непрапускны плат, скрось каторы няздольна дастацца да карэньняў жыцьцёдайнае паветра. Прапусьціць-жа гэта паветра да карэньняў можна пры помачы баранаваньня, або культыватарамі, да каторых, замест аднятых спружынавых зубоў, прымацоўваюцца вострыя нажы. Калі няма пад рукой ані сенажатнай бараны, ані скарыфікатара прыгатаванага з культыватара, дык можна—з бядой папалам—карыстацца і звычайнай вострай жалезнай бараной. Чым-бы ня было, а трэба ўвосень, **покуль суха**, дзярно сенажаці добра збаранаваць, пагнаіць і ўзноў л ё г к а прыбаранаваць, каб пагноі перамяшаліся з зямлёй.

Гнаіць сенажаці найлепш — перапрэўшым кампостам (вазоў дваццаць на гэктар), ці хоць-бы адным толькі дравесным попелам. Гной з пад скаціны на сенажаці менш прыгодны. Што датыча гнаеньня сенажаці пагноямі штучнымі (парашкамі), дык тут у першую чаргу прыходзяць пад увагу: каініт (потас) і тамасоўка (фосфар); за азот (у форме салетры, азотняку ці якой іншай) удзячна асабліва сенажаць новазаложаная, покуль на ёй не разрастуцца расьцінкі матыльковыя (ўсякія канюшыны). На сенажаці прад тым нягноеныя першы год даецца аж 8 мяшкоў (цэнтнараў) каініту і 5 мяшкоў тамасоўкі. Пасьля праз год-другі хапае ўжо меншая колькасьць самога толькі каініту і што трычатыры гады — па паўтара мяшка тамасоўкі. Высяваючы каініт з тамасоўкай можна іх з сабой перамяшаць, але мешаніну трэба **йшчэ таго самага дня высеіць**, бо саб'ецца ў камень. Каб мешаніна гэта лепш расьцярушвалася, яе прад сяўбой яшчэ перамешваюць з пакрышаным торфам. Гэтак пагноеная сенажаць дасьць вя толькі больш сена, але і якасьць ягоная паправіцца: замест цьвёрдай асакі, пачынае расьці салодкі мурог, дзяцеліна. Адзін толькі варунак прад усякім гнаеньнем мусіць быць споўнены: замокшыя сенажаці мусяць быць загадзя асушаны. Заліўныя сенажаці можна гнаіць толькі пасьля вясьнянага заліву.

Хто меў-бы сумнівы, якія на сваю сенажаць даць штучныя пагноі, хай сёлета йшчэ зробіць гэткую, вельмі танную пробу: адмерыць кусок асушанай сенажаці у 100 квадр. мэтраў (1 ар =10 м. удоўжкі і 10м. упоперак), добра разбарануе, абсее мешанінай 8 кілё тамасоўкі і 4 кілё каініту і ўзноў забарануе. Можна быць пэўным, што гэта танная проба

З практыкі і для практыкі.

а) Як я садзіў сад.

Перад тым як садзіць сад, я прыгатаваў ямы, у дыямэтры (ўшыркі) 1 мэтр і ўглыбку — паўмэтра. Потым у гэтыя ямы насыпаў трасочніку, які гніў там праз паўгода (гэта знача ад вясны да восені). Увосень купіў я 20 дрэўцаў садовых, пераважна зімовых сартоў і пасадзіў іх у гатовыя ўжо ямы ды самыя дрэўцы папрывязываў саломянымі перавяслямі да калоў каля іх убітых, каб вецер ня мог іх раскратываць. Пасьля гэтага я добра абгарадзіў свой сад плотам і каля плоту кругом пасадзіў ляшчыны, каб сад абараніць ад вялікага ветру.

К—к.

Ад рэдакцыі: Гэтак у кароткіх словах апісаў нам сваю працу адзін малады наш супрацоўнік. Цэнныя гэтыя, бо з практычнага жыцьця беспасярэдна паходзячыя, радкі ўважаем за абавязак свой дапоўніць некалькімі паясьненьнямі.

Садаводзтва за апошні час вельмі разьвіваецца і што ўчора было для яго непарушным правілам, аб тым сягоньня гавораць як аб устарэўшым забабоне. Да прыкладу — справа капаньня ямаў. Калі да нядаўна йшчэ ўважалася за канешнае капаць ямы прынамся за паўгоду перад пасадкай дрэў, дык сягоньня хапае на гэта пара дзён... Тых, хто цікавіцца гэтай справай шырэй, адсылаем да № 1 „Самапомачы“ з мін. 1932 году.

У глебах бедных адна яма ад другой капаецца на адлежнасьці 10 мэтраў, а на цяжэйшых — 15—20 м. Выкапаную з ямаў зямлю трэба шырака раскінуць, а ў самую яму, прад саджэньнем у яе дрэўца, насыпаць добра прагноенай зямлі, напр. з гароду, з бульбянішча. Гною хляўнога, асабліва сьвежага дадаваць у ямы ня можна, але можна і вельмі пажадана даваць туды перапрэўшы кампост. У ямы ў гліне апрача таго дадаецца — ўперамешку з рэштай зямлі — 4—5 лапат торфу або пяску, а на пясках — гэтулькі ж — гліны або торфу.

Прад тым як засыпаць яму зямлёй, пасярэдзіне ямы і крыху на паўдзённы захад убіваецца гладкі, знізу апалены кол, да каторага пасьля саламяным перавяслам, скручаным у форме васьмёркі, **вольна** — каб магло асядаць — прывязваецца новапасаджанае дрэўца. Садзіць само дрэўца найлепш увосені, калі спадуць лісты і пакуль не настануць маразы; але можна гэта рабіць і вясной (на глебе лёгкай).

Аб самым саджэньні трэба сказаць, што да гэтага ў нашых старонках найлепш прыгодны **маладыя** шчапы поўпенных дрэўцаў (ад караня да кароны — 1.20—1.30 м.). Усе скалечаныя карані абразаюцца роўна і замазываюцца шчаповай масьцю або жывіцай. Што датыча глыбкі саджэньня, дык лепш наагул садзіць за мелка, як за глыбака. Агулам рахуецца, што г. зв. шыйка караня (мейсца, дзе кончыцца пень і пачынаецца карэнь) павінна астацца на якіх 5 см. над паверхняй зямлі. Усё-ж саджэньне праводзіцца гэтак: — Упоперак ямы, з аднаго берагу на другі, кладзецца перакладзіна і пры ёй, на паўночны ўсход ад загадзя ўбітага кала, пасярэдзіне ямы, устаўляецца дрэўца на жаданую глыбку, пры чым вышыня перакладзіны ўважаецца за вышыню паверхні самой зямлі. Карэньні дрэўца прад пасадкай змачываюцца ў рашчыне прыгатаванай з 2 лапат гліны, 1 лапаты скаціннага гною, $^1/_2$ лапаты попелу і гэтулькі вады, колькі трэба, каб усё гэта разбавіць на рэдкую кашу. Гэтак умочаныя карані раскладвае адзін работнік па загадзя насыпанай у яме зямлі, падчас калі другі работнік час-ад-часу пакручвае дрэўцам, каб зямля добра ўлягласся і не пакінула ніводнай незапоўненай шпары. Пасьля ямы засыпаюцца, ўтаптываецца і акрамя таго пры васеньняй пасадцы робіцца каля пня невялікі, каля 30 см высокі копчык, які бароніць дрэўца ад марозу. Вясной гэты копчык разгортываецца і з яго робіцца міска, у каторай затрымоўвуецца вада. Само паліваньне ўвосені непатрэбна, але вясной — канешнае. Кругом пасаджанага дрэўца вясной раскладваецца хляўны перапрэўшы гной або кампост. У чэрвені м-цы дрэўцы прывязваюцца да калоў моцна, бо асяданьне ўжо так як і выключана.

праканае ўсякага „няверная Тамаша“ аб патрэбе дагляду і гнаеньня сенажаці.

Урэшце слоў пару аб абнаўленьні ўстарэўшых сенажацяў, заросшых усякім пустазельлем. Гэткія сенажаці прад зімой трэба глыбака ўзараць — пагнаіўшы (паводле магчымасьці) прад тым яшчэ хляўным гноем з-пад скаціны. На другі год на гэткай узаранай сенажаці найлепш засадзіць бульбу; можна і морхву, буракі. Пасьля даць авёс, а прыгнаіўшы тамасоўкай з каінітам — узноў бульбу. Калі гэтак глеба ачысьціцца ад пустазельля і прагноіцца, тады яе нанова засяваюць насеньнем мурожных траваў і матыльковымі.

Б. М—гк.

б) **Ці ёсьць карысьць садзіць кармавую морхву**

Я да гэтага часу садзіў толькі кармавыя буракі для быдла і ніколі не садзіў кармавой морхвы. Але калі буракі ня надта добра расьлі, то я пасадзіў на пробу таксама і кармавую морхву. І аказалася, што кармавая морхва лепей расьце як буракі, а пры гэтым яна ня так баялася сушы і макрыні. Бо побач з ей расьлі і буракі; як на сялетні мокры год, то мейсца было за мокрае і аказалася,

што ўсё-ж морхва вырасла шмат лепшая за буракі. А пры гэтым і быдла есьць яе вельмі ахвотна. Дык з гэтага вывад, што мы павінны старацца каб больш садзіць морхвы.

К—к.

Ад рэдакцыі: Саджэньне і выкарыстоўваньне морхвы заслугоўвае бязумоўна больш увагі нашага гаспадара-земляроба, чымся было дагэтуль. Кармавая вартасьць морхвы была ацэнена толькі падчас апошняй вайны. Ураджаем сваім яна бязумоўна выпярэджвае бульбу. Найлепш родзіць у глыбокай, вогкай глебе, якая мае досыць перагною, на зааранах сенажацях, спушчаных ставох і добра загаспадараваных тарфянішчах. Горш удаецца на пяскох і гляёх. Патрабуе глебу чыстую ад пырніку і ўсякага іншага пустазельля, любіць другую гнойную сілу, хоць удаецца і ў сіле першай. Трэба толькі гнаіць пад морхву перапрэўшым гноем конскім ці скацінным яшчэ з раньняй восені.

Вясной пераворываць поле пад морхву ўжо ня час, тымбольш, што сяўба павінна праводзіцца як мага раней, бо морхва вясьняных прымаразкаў не баіцца, а для прарастаньня свайго патрабуе ў глебе шмат зімавой вогкасьці. Прад самай сяўбой трэба поле звалаваць і сеяць ня глыбака, 1—2 см., найлепш у радкі аддаленыя ад сябе на 35—40 см. Высейваецца гэтак на гэктар 4 кілё насеньня, тады як пры сяўбе на шырака спатрабуецца аж 8—10 кілё, а да таго — морхву сеяную на шырака вельмі трудна палоць і наагул даглядаць.

Насеньне морхвы, як ведама, касматае і як такое вельмі шчэпліваецца ў камочкі, што перашкаджае пры сяўбе. Дзеля гэтага паважнейшыя насенныя фірмы самі абіваюць (выгладжываюць) сяўбовае насеньне морхвы і прадаюць яго ўжо гатовым да сяўбы. Гэта выгладжываньне можа правесьці аднак і кожны сам: насеньне перамешваецца з вострым пяском, усыпаецца ў густы мяшок і вольна перамешваецца, а пасьля праз рэшата высяваецца.

Морхва вельмі памалу ўсходзіць і памагчы ёй у гэтым можна тым, што насеньне прад сяўбой намачываецца праз нейкі час у вадзе. Засееная морхва патрабуе дагляду: яе трэба палоць, прарываць, матыкаваць (або і аборываць — у зялёнашыйкі). Капаньне морхвы адбываецца да познай восені; а перахоўвуецца морхва найлепш у скляпох, перасыпаная торфавым парашком.

Пры заснаўваньні новых кааператываў усе абавязкавыя абвесткі давайце ў „САМАПОМАЧ“!

Яшчэ ў справе насеньня дзічак.

Закранутае намі ў прошлым нумары „Самапомачы“ пытаньне аб зьбіраньні зярнят з дзікіх перадусім сартоў ігрушак (гнілак) і яблыкаў адбілася рэхам у часопісі „Шлях Моладзі“, дзе грам. Л. Войцікава на гэту тэму піша між іншым гэтак:

„Колькасьць насеньня, якая ў нас пры ахвоце і стараньні можа быць сабраная, ня будзе выкарыстана на месцы. Тымчасам... Віленскія гандлёвыя фірмы... выпісваюць насеньне дзікіх яблыняў і йгруш — з Францыі. — Чаму тыя грошы, што ідуць заграніцу, не маглі-б астацца ў руках нашай моладзі?

Дзе ёсьць шмат грушак-дзічак, там можна, ядучы іх, зьбіраць насеньне. Марудная гэта рэч, але магчымая, калі і з ігрушкамі пастутіаць так, як і з дзікімі яблыкамі: трэба закапаць у хляве (дзеля цяпла) меншую ці большую бочку і кожны пласт дзічак у ёй перасыпаць пластам зямлі. Калі яны добра перагнеюць, выбіраем іх на рэшата і пераціраем рукамі, паліваючы вадой. На рэшаце астануцца чыстыя зярняты. Перасушываем іх на сітах ці рэшатах (толькі ня ў печы) і трымаем да часу прадажы ў сухім месцы.

Сёлета цана насеньня яблыкаў за кілё — 5 зл., грушак — 7 зл.“

Сапраўды — рэч вартая ўвагі, бо магучая лёгка прынесьці ў хату нашага селяніна вольны грош на зварот.

В. Р.

Гаспадарчая хроніка.

Шукаюць нашых грыбоў. — Дэлегаты Французскай Фэдэрацыі Коопэратываў у апошніх днях м-ца верасьня адведалі Вільню, дзе спэцыяльна цікавіліся магчымасьцямі закупу грыбоў на экспорт у Францыю. У будучым годзе справай скупу грыбоў мусяць зацікавіцца нашы коопэратывы, каб затрымаць увесь заработак для тых, хто зьбіраньнем і сушэньнем грыбоў займаецца, для нашых сялян.

З сыраварняў. На абшары Наваградчыны (Уша, Адамполь, Шчорсы, Дзікушкі) пачало апошнім часам разьвівацца сыраварства, асабліва выраб сыру эйдамскага. Каб палепшыць прадукцыю сыроў, у м-цы кастрычніку ці лістападзе ў Баранавічах мае быць арганізавана акружная ацэнка сыроў.

Скасаваньне „Цэтроцэмэнту“. „Цэнтроцэмэнт“ гэта картэль цэмэтарняў у Польшчы, які трымаў у сваіх руках ня толькі выраб, але і гандаль цэмэнтам, дыктуючы на яго цэны. Апошнім часам гэты картэль скасаваны і цэны на цэмэнт з 6 зл. за 100 кілё зараз-жа абнізіліся да 3 зл. 50 гр. — Шкада толькі, што гэта абніжка цэнаў прыходзіць ужо як „лыжка па абедзе“, бо сэзон будаўляны ўжо кончыўся.

Новы праект закону аб падатку ад грунту прыгатаўляецца ў міністэрстве Скарбу. Мае пры гэтым быць узята пад увагу якасьць грунту і г. зв. эканамічныя вокругі.



Redaktar-Vydaviec inž. A. KLIMOVIČ.

Biełaruskaja Drukarnia im. Fr. Skaryny, Vilnia, Zavalnaja 1—3.

Цэны у Вільні

З збажжова - таварнай і льнярскай біржы у Вільні з дн. 9.Х.1933 г.

Цэны за 100 кілё сярэдняй якасьці.

Цэны транзакцыйныя:

Жыта І, станд. (адборнае)	15.85
Грэчка	19.75
Мука пшонная, 0000 А. люкс.	35.00—39.37
Мука жытняя да 55 проц.	25.00—28.00
Мука жытняя да 65 проц.	21.00—22.00
Мука жытняя разовая	17.25
Семя льняное 90 проц.	30.30 30.60

Цэны арыентацыйныя:

Жыта II, станд.	15.20
Пшаніца зьбіраная	22.50
Ячмень на пансак зьбіраны	15.00—15.50
Авёс стандартовы (адборны)	15.00
Мука жытняя сітковая	18.00
Мука разовая шатраваная	18.50
Вотрубы жытнія	8.50
Вотрубы пшонныя ценькія	8.75
Вотрубы ячменныя	7.50
Крупы грэчневыя 1/1 паленыя, кілё	0.40
Крупы грэчневыя 1/2 паленыя, „	0 37
Крупы грэчневыя 1/1 белыя „	0.37
Пансак № 2 „	0.24-0.25
Пансак № 3 „	0.31
Крупы аўсяныя „	0.47
Бульба сталовая „	0 06
Сена 100 „	5.50
Салома „ „	5.00

Курс грашэй: за даляр плацілі 5.85—5.87, за рубель залаты 4.69 зл.

Цэны прадуктаў малочных 10.Х.33.

Масла найлепшае за 1 кілё ў гурце.	3 50
„ „ „ „ „ ў дэталю	3.80
Масла сталовае за 1 кілё ў гурце.	3.30
„ „ „ „ „ ў дэталю	3.60
Масла соленае за 1 кілё ў гурце.	3.00
„ „ „ „ „ ў дэталю	3.30
Сыры „наваградзкія“ за 1 кілё ў гурце	2.10
„ „ „ „ „ ў дэталю	2.40
Яйкі за капу ў груце	4.50—5.70
„ „ „ за штуку	0.09—0.11

Цэны на рыбу 10.Х.33.

(За 1 кілё ў дэталю).

Карпы жывыя	1.90—2.20
Шчупакі „	2.00—2.40
„ няжывыя	1.50
Плотка	0.40—0.50
Ляшчы	1.80
Акуні	1.30 -1.50

Цэны на быдла і мяса 10.Х.33.

Жывец: бугаі з пашы за 1 кілё	0.38—0.42
ялаўкі клустыя „	0.50—0.55
Мясабітае: ялаўкі клустыя за кіл.	0.80—0.90
бугаі на мяса „ „	0.58 - 0.65
бараніна за кілё	0.80
цяляціна „ „	1.00
Сьвіні-жывец: 1-шы сорт за кілё	0.90 —1.20
2-гі „ „ „	0.75— 0.90
мацёры і кастраты	0.60 - 0.80
Сьвіні бітыя за кілё	1.35 - 1.50

За мін. тыдзень вывезена ў Варшаву і Лодзь 19 вагонаў жыўца.

—о—

Скуры сырыя, нявырабленыя: быдлячыя цяжкія за кілё 0.95 зл., скуры цялячыя за штуку 4 50 5.00 зл., авечыя аўчынкі — 4 зл.

—о—

Грыбы: за кілё суш. баравікоў 1-га сорту 20 зл., 2-га сорту — 15 зл.



Ужо хутка выйдзе з друку і пастуле ў прадажу БЕЛАРУСКІ АДРЫЎНЫ КАЛЕНДАР на 1934 год. – Мае ён два стылі: новы (каталіцкі лацінкай) і стары (праваслаўны—кірыліцай), а так-жа многа рознароднага і цікавага матэрыялу. Каштаваць будзе ён усяго каля 60 грошаў.

Беларускі Адрыўны Календар можна купіць-выпісаць з Бел. Кнігарні „ПАГОНЯ“ ў Вільні вуліца Завальная 1—', а паза Вільняй у звычайных прадаоцоў.

Перапрадаўцом уступка.



Pierasyłka apłačana ryčałtam.



CANA NUMARU 40 HRAŠOŬ